…зэта рабоча-сялянскай моладзі Беларусі

Чырвоная Зьмена

…н Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Ленінскага Камуністычнага Саюзу Моладзі Беларусі

№ 20 (402) Серада, 16 лютага 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у сераду, пятніцу і нядзелю | Год выд. VI. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. дню. Тэл. № 90 | Адрас Выдавецтва ЦК ЛКСМБ „Чырвоная Зьмена“ Менск, Камсам. 27

За пагоджанасьць і конкрэтнае кіраўніцтва ў культ-масавай працы.

…Комсамольскія організацыі да гэтых …у ня маюць добрай сувязі з органа…галоўполітасьветы на месцах, няма у …пасьці выпадкаў, увязкі і нагоджа…ці політасьветпрацы, праваджэнай ком…лам і акруговымі і раённымі устано…і Політасьветы сярод вясковай мола… Мы бачым такія факты, калі органы …оўполітасьветы на месцах ня лічуць …м прамым абавязкам вядзеньне культ…авай працы сярод мас моладзі у цес…і сувязі з комсамолам; з другога боку, …а комсамолу і дапамога у агульнай …тасьветпрацы недастатковы. Задача …енпаньня і пашырэньня культурна…авай працы сярод вясковай моладзі на…бус цяпер поўнай увязкі працы ком…олу у гэтай галіне з органамі Політ…веты, сумеснага скарыстаньня маючых…сіл і сродкаў для разгортваньня політ…ветпрацы сярод вясковай моладзі.

…Таму нашы комсамольскія організацыі …ены цяпер устанавіць цесную сувязь …Акрполітасьветамі, Райполітасьветамі, …а выдзяліць дзелавых прадстаўнікоў, …даць пляны працы, практыкаваць су…ную распрацоўку асобных пытаньняў, …адзіць вучот працы.

…Другі момант організацыйнага парад…на якім трэба застанавіцца—датычыц…працы вясковай ячэйкі у хаце-чы…ьні.

…І там да гэтага часу няма у шэрагу …адкаў увязкі працы комсамольскай …йкі і хаты чытальні у галіне політ…ветпрацы, недастаткова ўвязаны пля… …Пагэтаму у некаторых выпадках зры…цца праца сярод дарослага насельніцтва. …ваецца у шэрагу выпадкаў правядзень… асобных мерапрыемств культурна-ма…ай працы сярод вясковай моладзі. На…ому, неабходна зьвярнуць увагу на ўвяз… працы ячэйкі з саветам хаты-чытальн… …Для забясьпечваньня рэгулярнага пра…дзеньня масавых мерапрыемств сярод …адзі (чырвоная вячорка, масавыя гуль…, трэба ўстанавіць на працягу вядзе… …моладзі, які скарыстоўваецца …масавых мерапрыемств. Мерапрыем…ы, зьвязаныя штодзеннай масава-куль…рнай працы сярод моладзі, таксама павінны быць уключаны у агульныя пляны працы савету хаты-чытальні.

Трэці момант—гэта аб гуртках пры хатах-чытальнях. У большай сваей частцы існаваўшыя да гэтага часу гурткі былі гурткамі моладзі і дарослых: сельгаспадарчыя гурткі, драматычныя, харавыя і г. д. Такое існаваньне сумесных гурткоў выклікалася і выклікаецца маласьцю сродкаў, сіл, памяшканьняў для працы, а таксама неабходнасьцю большага ўцягненьня дарослага насельніцтва у політасьветпрацу. Замацоўваючы працу сумесных гурткоў, магчыма дапусьціць і організацыю «маладзежных» гурткоў, напрыклад: фізвыхаваньня, агульна-адукацыйны, пры наліччы адпаведных сіл і запатрабаваньняў.

Чацьвертым - асабліва важным момантам зьяўляецца падрыхтоўка нізавога організатара масава-культурнай працы. Неабходна наша кіраўніцтва зрабіць больш конкрэтным, дапамогу і падрыхтоўку больш сыстэматычнымі.

З гэтай мэтай неабходна: на нашых райкурсах актыву больш увагі і месца зьвярнуць растлумачэньню і азнаямленьню з конкрэтнымі формамі культурна-масавай працы; там, дзе магчыма як вопыт, правесьці каротка-тэрміновыя курсы—нарады (2—3 дні) працаўнікоў ячэек вядучых культурна-масавую працу. Такія курсы трэба склікаць сумесна з Райполітасьветамі; таксама вельмі важна праз Політасьветы (акруговыя, раённыя) прыняць меры да забясьпечаньня і прасоўваньня ў хаты-чытальні адпаведнай літаратуры, напрыклад: часопісь «Вясковы Тэатр», журнал «Хата-Чытальня» і г. д.

Трэба зьвярнуць увагу ячэек на скарыстаньне і праламленьне у сваіх умовах мерапрыемстваў культурна-масавай працы, якія знаходзяць сваё высьвятленьне на старонках комсамольскага друку.

Вельмі важна, каб акруговыя і раённыя камітэты наладзілі перадачу вопыту новых пачынаньняў уведзеных у той ці іншай …—другім ячэйкам сваей акругі, свайго раёну, скарыстоўваючы для гэтага усялякія нарады.

…рыхтуйцеся да дню Чырвонай Арміі.

Дарагія таварышы!

23 лютага споўніцца 9-я гадавіна …ваньня Рабоча-Сялянскай Чырвонай …міі. 9 год упартай і напружанай ба…ьбы за справу рабочае клясы і ся…ства, за забясьпечаньне спакойнага …ўніцтва нашага Саюзу Савецкіх Со…лістычных Рэспублік.

…Сплочанай, акрэпшай з узростам по…ычнай актыўнасьцю і ясным разуменьн… сваіх гістарычных задач, уступае …па Чырвоная Армія у 10-ы год свайго …аваньня.

…Сучасная міжнародная абстаноўка ха…ктарызуецца ростам імпэрыялістычных …ненпяў усяго капіталістычнага сьвету …ашых заходніх суседзяў, у асаблівась… ставіць перад Чырвонай Арміяй і пе… усімі працоўнымі Саюзу, пагрозу …ву нашага спакойнага соцыялістычна… будаўніцтва. Гэтая пагроза ня можа …рыцягнуць самае пільнае ўвагі з бо… працоўных да пытаньняў абароназдо…насьці нашай краіны, да пытаньняў …ацца і будаўніцтва рабоча-сялянскай …рвонай Арміі.

…Апошнія гады нашай працы па аба…не праходзілі пад лёзунгам удзелу пра…ўных мас у ваенным будаўніцтве, у …ацаваньні тэрыторыяльнай сыстэмы, палепшаньні працы па дапрызыўнай падрыхтоўцы, углыбленьню сыстэмы шэфства над Чырвонай Арміяй і значным узростам шырокіх дабраахвотных організацый ОСО і Авіахіму.

Гэтыя-ж задачы захоўваюць усё сваё значэньне і на гэты дзень. Яны патрабуюць яшчэ большай увагі і напружаньня, яны набываюць асаблівае значаньне для БССР, знаходзячайся на рубяжы з імпэрыялістычнай Эўропай. 23 лютага—9-ю гадавіну Чырвонай Арміі—трэба правесьці пад знакам умацненьня сувязі паміж рабоча-сялянскімі масамі і Чырвонай Арміяй, пад лёзунгамі шырокай ваенізацыі насельніцтва і пашырэньня работы ОСО—Авіахіму.

К гэтаму дню прыўрочыць асьвятленьне пытаньняў міжнароднага становішча і задач абароны СССР.

Практычныя пытаньні організацыі гэтага дню павінны быць узгоднены з Політаддзеламі найбольш буйных вайсковых частак знаходзячыхся на тэрыторыі акругі.

За Сакратара ЦК КП(б)Б
Рыжоў.

Нам. Заг. АПА ЦК КП(б)Б
Раманчук.

Далоў белы тэрор.

(Рэзолюцыя сходу моладзі мястэчка Зарэчча-Талочына).

Заслухаўшы даклад аб белым тэрору фашысцкага ураду Польшчы над пра…ўнымі масамі Заходняй Беларусі, агульны сход сялянскай моладзі мястэчка За…эчча-Талочына выказвае свой протэст супроць агіднай расправы польскіх паноў, …орачых над рабочымі і сялянамі.

Пілсудчына думае задушыць нацыянальна-рэволюцыйны рух працоўных мас …хам арышту, турмы і бізуна польскай дэфэнзывы, але гэтым мэта фашыстых … будзе дасягнута. Адзінкі задушаных заменяць сотні новых барацьбітоў.

Далоў польскі фашызм і прыгнёт Пілсудчыны!

Ганьба прыгнятацелям і катам рабочае клясы наймітам ангельскага імпэрыя…зму.

Няхай жыве сусьветная рэволюцыя і вызваленьне працоўных мас Польшчы!

Прэзыдыум сходу.

Англія не адмовілася ад політыкі нажыму на Кітай.

О'Малі загадана няісьці на ўступкі.

Згодна вестак з Пекіна, атрыманыя О'Малі новыя інструкцыі загадваюць яму …рабіць больш уступак нацыянальнаму ўраду і ні ў якім выпадку не закранаць …перамовах пытаньня аб пасланых у Кітай войсках.

Абвастрэньне польска-нямецкіх адносін.

Зрыў польска-нямецкіх гандлёвых перамоў зрабіў вялікае ўражаньне. Водлуг агульнае думкі, адносіны між Польшчай і Нямеччынай вельмі абвастрыліся.

Дэпутат Стронскі, які лічыцца у Польшчы добра ведаючым міжнародную політыку, заявіў у гутарцы з журналістымі, што галоўнаю прычынаю зрыву перамоў зьяўляецца, на яго думцы, жаданьне нямецкага ураду моцна абвастрыць адносіны з Польшчай, з мэтай высунуць політычныя патрабаваньні і узьняць пытаньне аб граніцы.

Бартэль ускладае адказнасьць на Нямеччыну.

На пасяджэньні сойму з заявою ад імя ураду выступіў Бартэль.

Закрануўшы пытаньні замежнае політыкі, Бартэль заявіў, што Нямеччына перарвала працу польска-нямецкае камісіі па пытаньнях аб правох грамадзян кожнае з дзяржаў на тэрыторыі другой з іх.

«Польскі урад,—заявіў Бартэль,—ня верыць, што нямецкі урад перарве і гандлёвыя перамовы поўнасьцю з-за непрадоўжаньня тэрміну набыту у Польшчы чатыром нямецкім грамадзянам. Калі гэта здарыцца, дык я павінен загадзя заявіць, што адказнасьць за гэты зрыў ускладаецца цалкам на сучасны нямецкі урад».

Бартэль адхіляў чуткі аб вайсковых надрыхтоўках Польшчы проці СССР. «Польшча зусім не зацікаўлена,—заявіў ен,—у ваенным конфлікце з СССР. Ня маючы нічога у прынцыпе проці перамоў аб гарантыйным акце, польскі урад лічыць патрэбным разпачаць перамовы з належнаю надрыхтоўкаю, не сьпяшаючыся».

Адзін з „кітоў“ Польшчы.

Чудотворецъ польскій пан провокатор.

Пасьля здрады гарняком.

„Правадыры“ пацяшаюцца прамовамі аб згоджанасьці клясаў.

Адчыніўся антыімпэрыялістычны конгрэс.

Авацыя ў чэсьць Кастрычнікавае рэволюцыі.

Учора у Брусэлі адчыніўся антыімпэрыялістычны зьезд, склікаапы «Лігай барацьбы супроць прыгнечаньня народаў». Прысутнічае 135 дэлегатаў ад прыгнечаных народаў. Зьезд адчыніўся прамовай прадстаўніка саюзу ангельскіх вуглякопаў Дэвіса. Ён зганьбіў ангельскі імпэрыялізм, вітаў кітайскую рэволюцыю і зазначыў на неабходнасьць поўнае салідарнасьці між рабочай клясай і прыгнечанымі народамі. Прамова Барбюса, якая разгарнула малюнак суровасьці імпэрыялістых, была спаткана гучнымі воплескамі, якія перайшлі ў авацыю, калі ён паказаў на СССР, як на маяк для прыгнечаных народаў. **У працягу 5 хвілін авацыя ў гонар Кастрычнікавае рэволюцыі ня спынялася.**

Зьезд заслухаў шэраг прывітаньняў, у тым ліку—ад прадстаўніка Выканкому Комінтэрну Катаямы, які заявіў, што Індыя і Кітай павінны падаць адзін другому рукі ў барацьбе. Прадстаўнік незалежнае рабочае партыі Англіі Броукэй заявіў, што ў выпадку вайны з Кітаем, партыя, прадстаўніком якое ён зьяўляецца, будзе на баку кітайскага народу. Затым Броукэй заявіў, што ў выпадку вайны з СССР ангельскі пролетарыят будзе на баку Савецкага Саюзу. Кітайская дэлегацыя пастанавіла падаць на зьезд рэзолюцыю, якая раіць зрабіць прапанову Амстэрдамскаму Інтэрнацыяналу, каб ён усямерна перашкодзіў ажыцьцяўленьню ваяўнічых плянаў імпэрыялістых супроць Кітаю і СССР.

Конфэрэнцыя чэха-славацкага комсамолу.

Скончылася конфэрэнцыя комуністычнага саюзу моладзі Чэха-Славакіі, у якой удзельнічала 80 дэлегатаў.

Конфэрэнцыя прайшла з вялікім уздымам пад лёзунгамі: «Барацьба за палепшаньне становішча рабочае моладзі», «Барацьба з беспрацоўем і за організацыю дапамогі беспрацоўным» «Барацьба проці новае вайны», «проці адабраньня ад салдат політычных правоў» і інш.

Конфэрэнцыя ў рэзолюцыі патрабуе скліку конгрэсу рабочае моладзі гораду і вёскі, а таксама легалізацыі Комуністычнага Саюзу Моладзі Чэха-Славакіі.

Дзяржавы Прыбалтыкі і СССР.

«Ваба Маа» заяўляе, што, водлуг вестак з аўторытэтных крыніц, на спатканьні эстонскага міністра замежных спраў Акаля з Латвійскім міністрам замежных спраў Цэленсам у Рызе была дасягнута поўная згода па пытаньні наконт утварэньня гарантыйнага угавору з СССР.

Радасьць вясны ў вачох.

...Пульхным дыванох ляжыць белы сьнег на далінах, узгорках Калінішчыны. Бель. Ад яе і у вачох рэжа. А вось і Сож.—Глыбокая рэчка, шырокая... І яна схавана пад белы дыван. Толькі дзе ні дзе выдма,—відаць сіні лёд... Вецер.

На сваіх скрыдлах ён нясе жмені радыёхваль. І вiснуць радыехвалі на ценкім дроце Клімавіцкай антэны... А антэна высокая—здалёку відна...

...Я ўглядаюся у іхнія твары. Маладыя, бадзёрыя. Вочы гараць радасьцю, адвагай.

Хто гэта маладыя, бадзёрыя, з вачмі, што радасьцю, адвагаю гараць?

— Бедякі.

«Я сын беднага селяніна, год нараджэньня 1906. Калі мне стала 8 гадоў я стаў працаваць у сваёй гаспадарцы—дапамагаць бацьком і братом. У сельскай школе правучыўся 4 гады. Далей мне ня прышлося вучыцца, бо ня пускалі бацькі таму, што трэба было працаваць на гаспадарцы, і к таму-ж **не сьвядомасьць нашага селяніна**. Гаспадарка маецца наступная: зямлі якая апрацоўваецца—3 дзесяціны. Жывёлы: 1 карова, 1 конь, сьвіней 2, душ сям'і—4.

З 1918 па 1924 год я выключна займаўся сельскай гаспадаркай, і ў 24 годзе мне прышлося паступіць у ячэйку ЛКСМБ, адзе я папемногу стаў займацца чыткай, як кніг, таксама і газэт і гэтым я сумеў падняць пісьменнасьць.

Я састаю сябрам коопэрацыі, дзе быў выбраны ў рэўкамісію гэта у 1925 годзе.

Патом быў сакратаром МОПР'у састаю сябрам пажарнай дружыны, сябрам Авіяхэму. З 1925 г. састаю сябрам райкому ЛКСМБ, адзе прымаю ўдзел у працы, і пры перавыбарах сельсавету я ізбраны ў сябры рэўкамісіі, но акрамя гэтага ў працы сельсавету дапамагаў тым, што пісаў сялянам заявы, перапіска протоколаў альбо созыў сходаў, пленумаў і г. д.

Но яшчэ састаю ў культкамісіі і намесьнік загадчыка вячэрняй школы сялянскай моладзі, адзе прышлося **раздабыць усё падручнікі і прылады для школы.** А ў сваёй гаспадарцы дапамагаю—даеш тлумачэньня у правільным вядзеньні гаспадаркі як карменьня жывёлы, аб тым каб былі добрыя будынкі для жывёлы. Сам пішу ў сваю акруговую газэту «Наш Працаўнік».

С. Зайцаў.

— **Батракі**. «Радзілася я, Ніжнікава—1907 г. Батрачка. Сучасны момант няма бацькі. Матка пролетарка. Наступіла у комсамол, каб больш палучыць знанія усебакова. Я сябар бюро ячэйкі, у атрадзе піонэраў працую. Яшчэ я сябра сельсавету. Ячэйка працуе здавальняюча. Плоха толькі—няма культурнасьці ў нашай вёсцы. У сельсавеце што трэба рабіць тое і раблю. Дзяўчат у комсамоле мала, немаецца, усяго адна. Піонэрак многа. Дзяўчат у комсамоле немаецца патаму, што нада работаць і яны думаюць—калі паступіш у комсамол то тады нельга работаць. Наадварот—можна быць і ў комсамоле і работаць. Нада больш кніжак для вёскі.

М. Ніжнікава».

— **Незаможныя серадзякі.** «Год нараджэньня 1907. Мой бацька служыў у памешчыка парабкам, а затым мельнікам быў. У нас зямлі ня было, але пасьля Акцябрскай рэволюцыі мы атрымалі зямлі пяць дзесяцін. На 6 душ, рабочых маецца 3 чалавекі. Культурнага такога ў гаспадарцы майго бацькі няма, но такія дасягненьні ёсьць, што раньняе ворыва на зяб, вобшчым харошая абработка зямлі, вось яшчэ, што пастроіў бацька сваю хату, а то жылі ў чужой хаце да 1925 году. Жывёл у нас 2 каровы і 2 быдлы т. е. коні. Культурную працу ў нас цяжка разгарнуць таму, што памешчык увесь час прыгнятаў нарабкоў.

Вёска ад гораду 80 верст самая захлусная. Но ўсё-ж зьдзьвіг ёсьць. У гэтым годзе наметілі пляп аб пераходзе на шматпольле, у мінулым годзе сеялі турнепс, які даў добрыя вынікі.

Працую я ў сельсавеце і ў КСУ. На каждым сходзе актыўна ўдзельнічаю. Гаспадарка наша сябр коопэрацыі. Я ўступіла у комсамол у 1925 г. Мая праца ў комсамоле—раней была політасьветчыкам, затым намесьнік сакратара, а цяпер жаночая праца.

Антаніна Ігнаценка».

І гэткіх Зайцавых, Ігнаценкаў, Ніжнікавых на Калінішчыне —чатыры тысячы семсот пяцьдзесят дзевяць. Вялікая армія! А заўтра—іх больш будзе!

Яны навучыліся заўважаць песьвядомасьць нашага селяніна, някультурнасьць у нашай вёсцы, навучыліся бачыць зьдзьвіг—бо самі мала на малу, але ўпарта, упаўнена будуюць, перабудоўваюць, працуюць і вучацца ў комсамоле, жыць паінакшаму, пановаму!

З якой чоткасьцю думак, з якім ленінскім адзінствам і разуменьнем сучасных абставін выступалі яны на 3-яй конфэрэнцыі Калінішчы.

Сакратар Калінінскага АК КП(б) тав. Гарбуз на адчыненьні казаў:

— Комсамол—галоўная крыніца, акуль партыя чэрпае свае сілы, але трэба памятаць, каб гэтая крыніца была чыстай.

Комсамолія Калінішчыны ў асноўным чыстая крыніца. Яна сёньня верны памочнік КП(б)Б.

У калінінскіх комсамольцаў, бадзёрасьць, адвага, радасьць вясны ў вачох.

Іл. Барашка

Будзем мяняцца вопытам.

Абмен вопыту будзе спрыяць паляпшэньню выхаваўчай працы.

Юнсэкцыі, наладжвайце цікавыя, вясёлыя і карысныя вечары для моладзі, гэтым вы здолееце адцягнуць моладзь ад мяшчанскіх вечарынак і хуліганства!



Юнсэкцыі плачуць.

Юнсэкцыі рабочых клюбаў плачуць, што няма магчымасьці задаволіць запросы моладзі, бо ў агульна-саюзных клюбах не разгорнеш працы. Гэта самае чутно і з боку сьвядомай моладзі якая кажа, што няма культурнага выхаваньня ў нашых клюбах. Адна ў месяц мастацкая пастаноўка, правільней вечар, не дае рэзультату, бо астатнія 30 дзён, інакш 3 суботы і 4 нядзелі куды хочаш дзенься.

У вялікіх раёнах, дзе маюцца клюбы аб'ядняючыя вялікі лік дарослых рабочых і моладзі, сам на сабе клюб з малою прапускною здольнасьцю. У некаторых малых раёнах справа яшчэ горш, там зусім малыя клюбы.

Праўленьні клюбаў пры складаньні плянаў працы адпушчаюць адзін дзень у месяц для вечару юнсэкцыі, далей унутраны распарадак клюбу, і моладзь куды хочаш, туды і ідзі.

Ня ўсё добра.

На вытворчасьці, у ўстановах, дзе моладзь праводзіць большую частку свайго часу, яна акрамя сваёй штодзённай работы, нічога ня ведае. У большасьці, у некаторых мясцох значная частка маладняка, а ні ў якую грамадзка-палітычную працу ня ўцягнута. Ня ўся яшчэ моладзь прывыкла быць на сходах, на нарадах. Гэта кажа аб тым, што моладзь трэба наступова прывучаць да нарад, да сходаў, якія наладжваюцца Комсамолам і профсаюзамі.

У якіх-жа умовах знаходзіцца моладзь і як яна праводзіць час пасьля працы? Тут таксама ня ўсё добра. Дамы ў рабочых раёнах, яшчэ ў процэсе будовы. У моладзі няма асобнага кутка, у якім яна-б магла чым небудзь заняцца. Да таго яшчэ хатнія, гаспадарчыя няўрадзіцы, размаітыя гутаркі, прымушаюць моладзь ісьці куды хочаш.

А тут 90 процантаў.

Пасьля ўсяго гэтага ўвечары моладзь знаходзіць месца толькі ў клюбе. А тут зноў складзены такія ўмовы, якія даюць супраціўленьне прытоку моладзі! На ўсіх культнарадах, конфэрэнцыях, пасяджэньнях праўленьняў клюбаў мы чуем пра наплыў моладзі ў клюб, пра 90 проц. з агульнага ліку наведваючых, мы чуем папрок, што быццам дзякуючы гэтым 90 проц. дарослы рабочы ня ідзе ў клюб.

Куды-ж дзецца?

Моладзь ідзе на вуліцу, да яе паслуг—сустрэча з хуліганамі, на вуліцы—піўныя, а для больш сьвядомых, калі ў кішэні грошы брынчаць—кіно. Вось такое звычайнае жыцьцё прымушае моладзь шукаць забаў. І выхад тут адзіны—

хатняя вечарынка.

Вечарынка для моладзі—гэта вялікая падзея вялікай важнасьці. Да вечарынкі рыхтуюцца тыднямі. Наладжаньне гэтых вечарынак заўсёды прыстасоўваецца да палучкі пэнсыі і абавязкова ў суботу. Вечарынкі жвава ўтвараюцца бязумоўна, на кожнага ўдзельніка таксама ўскладаецца абавязак—каму кватэру знайсьці, каму загатовіць да вечарынкі віпіўку і закуску, каму гармапістага адшукаць, а дзяўчатам—«прыгожанькіх» запрасіць, каб зрабіць лепшы выбар па прыгожасьці.

Можна пералічыць у Менску цэлы шэраг акраін, дзе гэткія вечарынкі цьвітуць, у поўным разгары. Вось яны: Серабранка, Койданаўскі тракт, Уборкі, Матвееўская, Пярэспа, Камароўка і г. д.

І ў юнсэкцыі нічога новага

А вечары, што наладжвае юнсэкцыя, будуюцца па звычайнаму шаблёну: афіцыйная частка (даклад), п'еса, скокі. Нового нічога няма. Усё старое. Ды і гэта вельмі рэдка—адзін раз у месяц. Ды і моладзі мала бывае на такіх вечарох юнсэкцыі.

На вечарынкі моладзь ідзе з большай ахвотай. Там зробяць складчыну, купяць гарэлцы, піўца, вып'юць, а затым і гуляць...

Вялікая задача—па інакшаму выхаваць.

Перад намі стаіць вялікая задача—выхаваць па інакшаму моладзь.

А нашыя клюбы не прыстасаваны да гэтага. Мала таго, што ў клюбе адзін раз у месяц юнсэкцыя наладжвае вечары. Наш клюб павінен выхоўваць у сябе чалавека нашай эпохі, з якога вырасьце Ленінец. Выхаваўчая задача нашага клюбу як раз ня ў тым, каб толькі шаблённымі програмамі вечароў здавальняць моладзь. Такая пастаноўка зьяўляецца на мой погляд нават сьмешнай і нікчэмнай.

Аднак, у некаторых юнсэкцыях маюцца характэрныя драбінкі працы, якая зацікаўлівае моладзь, якая разьвівае ў ёй пачуцьці колектывізму. І гэты **вопыт працы трэба вынесьці на старонкі нашай газэты, падзяліцца з юнсэкцыямі рабочых клюбаў, у якіх справа выхаваньня пастаўлена дрэнна.**

Толькі такім чынам ужыўшы усе формы і мэтоды ў працы юнсэкцыі магчыма будзе адарваць моладзь ад старых мяшчанскіх вечарынак, толькі такім чынам можна будзе задаволіць запатрабаваньні нашай новай моладзі.

Мікола Крук.

ЗА АБАРОНУ!

Моладзь у шэрагі ТСА-Авіяхіму

(Гутарка з сакратаром Белавіяхіму т. Фрэйдзінь

У сучасны момант наша організацыя па СССР налічвае звыш 2 мільёнаў сяброў. Наша Беларуская організацыя ня гледзячы на тое, што тэрыторыя Беларусі нявялікая, і то на 5 мільёнаў жыхароў налічвае 120.000 сяброў. На ўсесаюзным зьезьдзе Таварыства Садзейнічаньня Абароне і Авіяхіму адзначыў, што наша організацыя мае пад сабою цьвёрдую базу, мае ўсе ўмовы росту і наша задача павялічыць таварыства да дзясяткаў мільёнаў.

Таварыства Садзейнічаньня Абароне і Авіяхім мае пад сабою цэлы шэраг вялікіх і адказных задач. У мірных абставінах барацьба з рознага роду сельска-гаспадарчымі шкоднікамі. Такая праца была праведзена раней на Паўночным Каўказе па зьнішчэньні саранчы.

Авіяхім мае шэраг вопытных вучасткаў на якіх робіць розныя досьледы над павялічэньнем ураджайнасьці сельскай гаспадаркі.

У адносінах хэмічнага будаўніцтва—наша задача ня толькі абарона, але і наогул разьвіцьцё хэмічнай прамысловасьці як часткі соцыялістычнага будаўніцтва.

У галіне авіабудаўніцтва: узмацненьне паветранага флёту, як грамадзян… так і вайсковай авіяцыі. Авіяхім пе… ужо вайсковым ведамствам 159 бая… ных вайсковых самалётаў, створаны… сродкі таварыства. У сучасны момант… лёнага разгулу чорнай рэакцыі і фаш… у краінах раней уваходзячых у скла… сійскай імпэрыі элемэнты абароны у… ахіме набываюць асаблівае значэньне…

Праробленая таварыствам праца… зала жыцьцёвасьць і магутнасьць… організацыі.

У зьвязку са зьліяньнем Авіяхі… Таварыствам Садзейнічаньня Абарон… ганізацыя павялічылася на 300.000… лавек. У яе ўліваецца сьвежы струм… перад організацыяй паўстае цэлы… новых задач, як популярызацыя вае… ведаў сярод насельніцтва, ваенізацыя,… кова-дасьледчая праца па ўсім га… ваеннай навукі. Таварыства рэгу… комплектуе лётныя школы, якія па… тоўваюць лётчыкаў. Задача кожна… толькі комсамольца, але кожнага сьвя… га грамадзяніна СССР, зацікаўлен… справе абароны нашай краіны разьв… і ўдзелу ў соцыялістычным будаўні… —быць сябром гэтага Таварыства.

Вайсковыя куткі і ваенізацыя.

Комсамольцы і наогул уся моладзь ваенізацыяй вельмі цікавіцца.

Умела організаваць гэту справу, паставіць яе на належны шлях—і посьпех можа быць забясьпечаны цалкам на 100 працантаў.

Што моладзь захапляецца стральбой, тактыкай і іншымі вайсковымі пытаньнямі—гэта бясспрэчна.

Але як паставіць гэту справу так, каб моладзь магла набываць сабе вайсковыя веды і каб праца была цікавай?

Самым рацыянальным—гэта будзе організацыя вайсковых куткоў. Куток павінен зьяўляцца цэнтрам усёй працы па ваенізацыі.

Як організаваць вайсковы куток.

Куток вядома можа быць організаваны і пры клюбе і пры хаце-чытальні і г. д., дзе больш менш ёсьць досыць значная група зацікаўленай ў вайсковай справе моладзі.

Самае галоўнае гэта зьмест кутку і яго кіраўнікі. Ад гэтага цалкам залежыць посьпех усёй працы. Організаваць-ж… ток справа ня вельмі цяжкая.

Зьмест кутка.

У кутку могуць быць: нагляд… паможнікі, табліцы вайсковых выр… часопісяй, розныя плякаты, лёзунгі,… рымкі з закону аб абавязковым в… вым навучаньні, модэлі аэропланаў… каў і г. д.

Як бачыце, гэта ня вельмі так… цяжка набыць.

Цяпер аб больш складаным бак… сталяваньня кутку. Гэта аб рэчах… яльнага вайсковага назначэньня: в… ка, працівагазы, гранаты, пікі,… патроны вучэбныя, самадзелкавыя… акопаў, скрынкі з пяском для… ваньня вопытных умацаваньняў і г…

Гэта таксама, я не сказаў, што… ка набыць. Варта толькі зьвязаў… падшэфнымі вайсковымі часткамі.

Вінтоўка і вышэй памяненыя в… выя прылады, могуць шмат даць м… Хлапцы і дзяўчаты могуць азнаём… назначэньнем, будуць ведаць дз… прыкладна, гранаты Навіцкага ці… яе ўнутраны склад. Будуць ведац… якіх газаў абараняе працівагаз і ч…

Як з дзяўчатамі?

Дзяўчат таксама цікавіць як ст… вая тактычная, так і наогул вай… справа. Аб гэтым мы нават ведаем… сопісаў, газэт, дзе пісалі, што дзя… на стралковых спаборніцтвах бралі… першыя прызы.

Акрамя стралковае справы трэ… дзяўчат пры кутках організаваць… першай дапамогі.

— Дзяўчына павінна ведаць як… трэбны момант можна аказаць да… раненым.

Аб кіраўнікох кутках

Дзе атрымаць іх?

Тут на дапамогу можа прыйсьці… мандны склад запасу і ТСА (тава… садзейнічаньня абароне).

ТСА можа вылучыць свайго кір… альбо з камскладу запасу тых ячэ… організуецца куток.

Камандны склад запасу самы па… дзячы кіраўнік.

Важнае ў будучай вайне—гэта… Насельніцтва павінна ведаць што… газавы прытулак, працівагаз і як… можна абараніцца ад удушлівых… няў газу.

Далей. Як мысьліма ваеніза… поўным сэнсе гэтага слова?

— А вось: пры дапамозе кір… моладзь будзе мець магчымасьць… чыцца абходзіцца з вінтоўкай. Апр… тага азнаёміцца больш-менш з… вай тактыкай. Пад тактыкай трэб… мець: атакі, перабежка, наступлень… ступленьне і г. д.

* * *

Для організацыі пытаньняў с… чаньня абароне трэба ня толькі… чаць стралковую і вайсковую спра… таксама трэба прызадумацца над… нямі прыспасабленьня кожнага п… емства да абароны. Аб гэтым… таксама Менская акруговая конф… ТСА (таварыства садзейнічаньня а…

Неабходна шырокае ўступлень… ладзі ў шэрагі ТСА. ТСА дасьць кір… і дапамогу ў організацыі працы… вых куткоў.

Да усяго гэтага, яшчэ раз т… крэсьліць вялікую неабходнасьць… неньня сувязі з Чырвонай Арміяй… дапаможа справе ваенізацыі мола…

Як працаваў Менскі Акругком ЛКСМБ?

—Адміністрацыя не разумее рэжыму экономіі.—Дрэнна праводзіцца выхаваўчая праца сярод профшкольцаў.—Дрэнна працавалі прадстаўнікі ў ЦП Саюзаў.—Актыў не наведвае клюбаў.

Як ідзе экономпраца.

Т. Карнеяў. Пытаньне барацьбы з протэкцыянізмам АК не прапрацаваў як трэба быць. АК трэба урэгуляваць пытаньне з беспрацоўем сярод моладзі. Наша адміністрацыя не разумее рэжыму экономіі, у прыватнасьці на чыгунцы. Часта не прапускаюць і правальваюць на экзаменах т. т., якія жадаюць павысіць свой разрад, тлумачачы гэта тым, што праводзіцца рэжым экономіі. Шмат таварышоў ужо па чатыры гады не атрымоўваюць павышэньня свайго разраду.

Т. Раўтовіч. Выхаваўчая праца сярод профшкольцаў вядзецца кепска. Тут трэба выходзіць з тых умоў, у якіх знаходзяцца профшкольцы. Кепскія інтэрнаты, у якіх зусім нельга весьці працу.

Сканчаючыя профшколы таксама аказваюцца ў кепскіх умовах. Шмат з іх не атрымліваюць працы, а пасьля сканчэньня іх звальняюць з інтэрнатаў і ім нават няма дзе жыць. З разрадам у ФЗВ таксама дрэнна. Гаспадарчыя працаўнікі падымаюць разрад толькі праз 6 месяцаў, што дрэнна адбіваецца на падняцьці кваліфікацыі моладзі.

Т. Ліпман. Кваліфікацыя моладзі ў працколектывах праводзіцца кепска. Моладзь працуе на чорнай працы. Пасьля 6 месяцаў гэту моладзь зьнімаюць з працы ў працколектыве і дасылаюць на біржу працы. Патрэбна, каб АК на гэта зьвярнуў увагу. Дзеля павышэньня разраду трэба ўтвараць экспэртныя камісіі. Профдні рэдка праводзяцца, хаця яны павінны быць лепшай формай працы сярод рабочай моладзі.

Культурна-масавая праца

Т. Глэзер. Выхаваўчая праца, якую праводзяць юнсэкцыі, не здавальняе нашу моладзь. Трэба высоўваць больш цікавыя мэтады працы. Патрэбна ўзмацніць матар'яльную базу дзеля працы юнсэкцыі. Комсамольцы часта п'янствуюць, з гэтым зьявішчам трэба весьці рашучую барацьбу і комсамольцаў, якіх нельга справіць, трэба выключаць з комсамолу.

Хейфец. У працы сярод рабочай моладзі трэба зьвярнуць больш увагі на культ. масавую працу. Нашы ячэйкі мала зьвяртаюць увагі на працу нашых юнсэкцый.

Вытворчыя вечары ў нас часта праваливаюцца, толькі таму, што комсамольскія ячэйкі не зацікаўлены ў гэтым (друкары, харчэўнікі). Ня ўсе ячэйкі КСМ заўсёды наведваюць клюб КІМ. Мерапрыемствы, праводзімыя клюбам, не падтрымліваюцца ячэйкамі.

Наш комсамольскі актыў не наведваецца ў клюбы, сакратары ячэек, дык тыя зусім ніколі ня бываюць у клюбе.

* * *

Пасьля заключнага слова тав. Рубіна, абіраецца камісія для выпрацоўкі рэзолюцыі по дакладу.

Комсамол ў гаспадарчым будаўніцтве.

(Вынікі экономпрацы сярод моладзі)

Падводзячы вынікі экономпрацы, мінулага пэрыоду гледзячы на шэраг цяжкасьцяў і налічча недахопаў, мы маем плюсы ў гэтай працы.

Прыток падлеткаў у вытворчасьці быў досыць значны. За 1926 год паслана 479 чал. толькі па гораду. Выцясьненьне моладзі з вытворчасьці хоць і было, але вельмі нязначнае.

Значна ўзрос удзел моладзі ў гаспадарчым жыцьці прадпрыемстваў. Ёсьць шэраг фактаў якія сьведчаць, што комсамольцы далі шэраг прапаноў па праведзеньні рэжыму экономіі, прынёсшых значную экономію. Таксама палепшылася вытворчая дысцыпліна, хоць і ёсьць яшчэ такія прадпрыемствы, дзе дысцыпліна яшчэ не на належнай вышыні.



Сакратар Акругкома ЛКСМБ тав. ШАЛІМА

Горш абстаіць справа з удзелам у вытворчых нарадах. Гэта патрабуе зьвярнуць большую ўвагу з боку Комсамолу.

Удзел моладзі ў профпрацы таксама палепшыўся. Ячэйкі КСМ наогул зразумелі задачу аб узмацненьні работы профсаюзаў. Узрос удзел моладзі ў перавыбарчых кампаніях, а таксама на профпрацы, на 1-X 25 г.—263, на 1-VI 26 г.—301 (вынікаў апошняй кампаніі перавыбараў яшчэ няма). Узрасла таксама колькасьць падлеткаў у шэрагах профсаюзаў. У мінулым годзе мы мелі па гораду 642 падлеткі, а ў гэтым годзе 915 ч.

У галіне вучнёўства, ня гледзячы на шэраг адмоўных зьявішч (слабая ўвага гаспадарчых працаўнікоў і тэх. пэрсаналу ня ўсюды праведзена компэнсацыя, ня добра пастаўлена вывучэньне ў працколектывах і прыватных прадпрыемствах) мы маем тут вялікія дасягненьні. Пры нядаўнім аглядзе 6 прадпрыемстваў у Менску аказалася, што большасьць броні знаходзіцца на кваліфікаванай працы. На 689 кваліф. рабочых 150 вучняў. Вучнёўства прасунута ва ўсе цэхі прамысловасьці.

На гэтых прадпрыемствах мы маем моладзі, скончыўшай навучаньне ў працягу апошніх 2-х гадоў, якія знаходзяцца ўжо на 7—9 разр.—65 ч.

Праца сярод парабкоў таксама палепшылася, узмацніўся абхоп моладзі парабкоў—працоўнымі дагаворамі, што дасягае 85,5 проц. колькасьці парабкоў. У гэтым годзе выяўлена парабкоў больш на 89 пр. Узрасла таксама колькасьць парабкоў у моладзі ў профсаюзе 1|X 25 г. 464. 1|X 26 г.—855, 1|II 25 г.—470, 1|I 27 г. 667, і на актыўнай проф. працы з 59 у сел. батрачкомах 49 К. С. М.

Таксама палепшылася праца ў прыватных прадпрыемствах, узмацніўся прыток вучняў. Па двух мясцкомах скурнікаў і швэйнікаў у горадзе за 1926 г. павялічылася колькасьць вучняў на 175 чал. Па 4 мястэчках—144 чал. Таксама палепшыліся ўзаемаадносіны з саматужнікамі. Узмацніўся ўплыў комсамолу на гэтую рабочую моладзь.

Таксама ёсьць некаторыя дасягненьні і ў галіне паляпшэньня быту моладзі. Пасылка ў дамы адпачынку была значная, нормы аховы працы праводзяцца ўсюды (парушэньні ёсьць у прыватных прадпрыемствах). У сувязі з падцягваньнем адсталых груп рабочых па зарплаце, павялічылася зарплата падлеткаў. Адносна быту прыдзецца яшчэ больш працаваць, бо тут яшчэ зроблена мала.

Шнэйдэр.

У Менскім Камітэце ЛКСМ.

У склад бюро АК пленум абраў наступных т. т.: Ляўкова, Шаліма, Рубіна, Казанава, Шнэйдэра, Ільліна, Зейфмана, Шэйн, Карнеева, Пятровіча, Валіцкага, Левіна і Сірато.

У кандыдаты: Чабуноў, Штэйнгардт, Хвечэня, Шпак.

Склад сакратарыяту складзены наступны: Шаліма, Рубін, Казанаў.

КУЛЬТУРНЫ ДОСУГ ВЯСКОВАЙ МОЛАДЗІ

Гарманістых, плясуноў, скрыпачоў, штукароў, апавядальнікаў аб'яднаем у „мастацкія ядра“.

У вёсцы ёсьць шмат мажлівасьцяў для ажыўленьня культурна-масавай працы. Скарыстаем іх. Як наладзіць комсамольскую вячорку,

Утворым „мастацкія ядра“.

Дайце магчымасьць працаваць вясковым талентам.

Комсамольца, які ўмее організаваць ладзь вакол конкрэтнай, вызначанай мадзкай справы—мы называем актыві-ым.

На вопыце мінулых зьездаў гармані-ых, іх працы на мясцох, можна сьме-сказаць, што гарманісты ў шэрагу месц новіцца організатарам моладзі на ад-м з важнейшых вучасткаў нашай пра-—у барацьбе за новы быт, у барацьбе проць хуліганства, п'янства.

(Праўда, у большасьці гарманісты яшчэ парыць яблычка» на п'яных вячорках вёсцы).

А ці-ж добра пастаўлены спэктакль—адцягвае моладзь ад п'янкі, не зьяў-ецца растком культуры?

Вынікі такі: прыцягнуты на бок ячэй гарманісты, любіцель, скрыпач, бала-ечнік, цымбалісты, гітарысты апавядач, плетысты, дэкляматар, сьпявака і г. д. яны разам узятыя, і кожны асобна, зўляюцца актывістымі, організатарамі, конвацелямі культурна-масавых мера-ыемств, што праводзяцца комсамолам.

Наша задача—увесь гэты мастацкі тыў згуртаваць навокал культурнага продку вёскі, хаты-чытальні і з ім па-сьці працу. Організацыйнай формай пра з мастацкім актывам у шэрагу орга-зацыі ЎсеЛКСМ (Украіна, Менск) зной-ены—гэта «мастацкае ядро» пры ха-х-чытальнях.

Да організацыі «мастацкіх ядзер» па-ны распачаць працу і мы.

Каго аб'яднаюць «мастацкія ядра»!

— Усіх тых, хто мае і ўладае музычнымі прыладамі: гарманістых скрыпачоў, цымбалістых, удзельнікаў драм-гуртка, харавога, музычнага, куплятыстых і апавядачоў, словам усіх тых, хто мае які небудзь талент, які можа быць скарыстаны для організацыі разумнага адпачынку, увесяленьня моладзі, і дарослага насельніцтва вёскі.

Што павінны рабіць «мастацкія ядра? На першы раз—дзьве конкрэтныя прапановы: падбор адпаведнага рэпэртуару:—народных бытавых, рэволюцыйных сьпеваў —для хор-гуртка, рэволюцыйных дэклямацый—для дэкляматараў, гуртаваньнем мотываў—для музыкантаў, куплетыстых і г. д.

Другое: падрыхтоўка некалькіх чырвоных вячорак—пры чым на занятках «мастацкага ядра» выпрацоўваецца праграма гэтых вячорак, разьмяркоўваюцца абавязкі.

У чарговай старонцы культурна-масавай працы для вёскі будзе зьмешчана больш падрабязговая програма працы «мастацкага ядра».

Ячэйка комсамолу, ізбач павінны зараз-жа прыступіць да працы вучоту, гуртаваньня мастацкага актыву, распачаць організацыі «мастацкіх ядзер».

Трэба ўзяцца за падбор кіраўнікоў для «ядраў». Ім можа быць падрыхтаваны ізбач, культурны комсамолец, настаўнік.

Ліўшыц.

На конкурсе маскоўскіх гарманістых.

ЯК ОРГАНІЗАВАЦЬ ХОР-ГУРТОК.

Адна справа сабрацца ў гурток і развучыць песьні па вядомых мотывах, другая справа—утварыць сталы харавы гурток-хор, у якім развучываць на нотах пад кіраўніцтвам рэгента (кіраўніка) рознастайныя сьпевы і мэлёдыі.

У большасьці выпадкаў у ячэйках развучываюць песьні без кіраўніка па вядомых матывах. Але такі гурток ня мае пэрспэктыў для далейшага разьвіцьця, зьяўляецца выпадковым, без падбору галасоў, і яго рэкомэндаваць нашым ячэйкам нельга.

Зусім іншая справа—стварыць хор! Ён прынясе вялікую карысьць ячэйцы ў яе культурна-масавай працы. Бо і паслухаць будзе што калі ён будзе пець на вечары альбо на спэктаклі, і навучыцца будзе чаму. І моладзь запішацца ў яго і будзе працаваць, бо пець у хоры таму, хто мае добры голас—адно задавальненьне.

Што-ж трэба зрабіць?

Папершае—адшукаць кіраўніка-чалавека больш менш знаёмага з музыкаю, з нотамі, з добрым слухам. На дапамогу ячэйцы павінен прысьці хто небудзь з вясковай інтэлігенцыі (настаўнік, настаўніца). Калі толькі кіраўнік ёсьць, ячэйка апавяшчае запіс жадаючых працаваць у харавым гуртку. Запісваюцца ўсе жадаючыя, аднак кіраўнік робіць выбар з запісаных, прабуючы іх голас (напрыклад, той ці іншы хлапец, альбо дзяўчына пяе перад кіраўнікам вядомую ўжо ёй песьню). Адбор зроблены. Затым ідзе падбор па галасам дзяўчат—на дысканты (высокі голас), альты (вышэй сярэдняга), і хлапцоў—на тэнары (сярэдні) і басы (нізкі голас).

Досыць якіх небудзь 10-12 чалавек, каб стварыць гучны хор (3 дысканты, 4 альты, 3 тэнары і 2 басы).

Падбор зроблены, Для організаванасьці хору—утвараецца прэзыдыум харавога гуртку, у які ўваходзіць кіраўнік, прадстаўнік бюро комсамольскай ячэйкі і прадстаўнік ад харыстых, які і кіруе ўсёй працаю гуртку, выбірае рэпэртуар для сьпеваў, сочыць за дысцыплінай у гуртку, вызначае месца выступленьняў, проб і г. д.

Падбор рэпэртуару

Прэзыдыум гуртку робіць падбор рэпэртуару. Што важна—гэта рознастайнасьць рэпэртуару. Песьні павінны быць і рэволюцыйныя (як напр. «Інтэрнацыянал», Маладняк», «Ад веку мы спалі») і народна-гумарыстычныя (напр. «Камар», «Чачотачка», «Чаму-ж мне ня пець», «Лявоніха», «Гляну, гляну я ў ваконца», «А ў полі вярба» і г. д.). У рэпэртуары павінна быць усяго пакрысе—тады і слухаць будзе цікава.

Але самае галоўнае

гэта—добра сьпецца на пробах. Тут ужо справа залежыць ад здольнасьцяй кіраўніка. Дамагчыся таго, каб гладка і лоўка выходзіла песьня—яго справа. Ня трэба «падаць духам» калі на першы раз нічога ня выйдзе. Затое ў другі раз пры ахвоце харыстых будзе лепш. Пачынаць бязумоўна трэба з развучываньня лёгкіх мэлёдый, знаёмых і простых (бяз выкрунтасаў). Сам кіраўнік дае тон—як пець калі мотыў не знаёмы харыстым. А ад харыстаў патрабуецца—каб яны на памяць, кожны добра «на зубок» развучыў словы прызначанай да рэпэртуару песьні, бо няведаньне слоў выклікае разлад на пробе, зрывае пеяньне распачатага сьпеву усім хорам. І калі хор на пробах развуча восем—дзесяць песень, сьпяецца як кажуць, тады можна і выступаць на спэктаклях, пасьля сходаў, на вечарох.

Адно мною прапушчана—гэта дастаць сьпеўнікі. Іх можна купіць у любой кнігарні Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Беларускія сьпеўнікі маюцца наступныя: **Грыневіч**—школьны сьпеўнік; **Равінскі**—Беларускі сьпеўнік; **Тэраўскі**—Беларускі лірнік, Комсамольскі сьпеўнік, Піонэрскі сьпеўнік і інш. Іх-жа можна выпісаць і непасрэдна з Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва (Менск,Савецкая 63).

Стары Музыка.

Частушкі.

Вось па вуліцы бягуць
Хуліганы,
Толькі белы сьнег скрыпіць
Пад нагамі.
Яны хочуць у савет
Наш пралезьці,
І на мейсцы бедняка
Ў ім засесьці.
Хуліганам, кулаком—
У бок трасца,
У савет папасьці вам
Няўдасца!
А мы выбярэм ў савет
Камуністаў—
Людзей чэс ных, беднякоў—
Актывістаў.
Ну дык грай-жа вясялей
Гарманісты,
Гэй да працы у савеце
Комуністы!

Захар Бульбянік

Досуг рабочай моладзі.

Што лепш?

(Менск, юнсэкцыя саматужнікаў)

У апошні час вылучаюцца новыя мэтоды культ-масавай працы сярод моладзі. Гэтае пытаньне абгаварывалася і на пасяджэньні бюро юнсэкцыі саматужнікаў.

Бюро вынесла пастанову—купіць гармонік.

Мне здаецца, што гэтае пытаньне прадумана ня сур'ёзна. Трэба было ведаць, дзе і як можна прыстасаваць гармонік у працы юнсэкцыі, якая налічвае 250 чалавек. У нас гармоніку скарыстаць нельга. Ніхто з хлапцоў ня ўмее іграць на гармоніцы, а прыдзецца ўзяць інструктара для навучаньня, а там кожны захоча навучыцца і наогул атрымаецца неразьбярыха.

Памойму было-б мэтазгодна гэтыя 50-60 рублёй зрасходаваць на куплю інструмантаў для струннага оркэстру, бо гэтае пытаньне некалькі разоў абгаварвалася ў насьценнай газэце.

Бюро адхіліла гэта тлумачачы малымі сродкамі.

Трэба спадзявацца, што бюро юнсэкцыі прыме мае довады пад увагу.

Валодзька і Міхась.

У выніку „Інваліды“.

(Ст. Менск МББ, клюб ім. Ільліча)

У клюбе ім. Ільліча маецца цэлы шэраг недахопаў. Праўленьне клюбу і юнсэкцыя мала зьвяртаюць увагі на выпадкі хуліганства. У фойэ клюбу моладзь сабраўшыся на спэктакль ці кіно падымае бойкі, пачынаецца «французская» барацьба —ад якой крэслы і сталы застаюцца «інвалідамі». Удзел у гэтых «спаборніцтвах» прымаюць нават і комсамольцы з ячэйкі М.Ш.В. **Міньковіч і Лютынскі.**

Трэба, каб праўленьне клюбу больш зьвяртала ўвагі на недахопы.

Юнкор-**Чыгуначнік.**

Паседжаньнямі не задаволіш.

(Нова-Беліца, фабрыка «Везувій»)

Пры нашай фабрыцы маецца клюб, у гэтым клюбе, як і па ўсіх клюбах маецца юнсэкцыя.

Гэтая юнсэкцыя спачатку організацыі нешта рабіла, але цяпер сьпіць... Масавыя вечары не наладжваюцца, не праводзіцца і іншая масавая праца.

Што робіць юнсэкцыя—дык гэта склікае паседжаньні праўленьня.

Але аднымі паседжаньнямі масу не задаволіш!

С. Мэйцін.

Пашырым рэпэртуар гарманістых.

Бабруйскі акруговы зьезд гарманістых, ённыя і акруговыя конкурсы на лепага гарманістага паказалі, што гармонікі дуюць нашу моладзь толькі «кракавям», «тустэпам», «вальсам», «полькай», ты сидишь у камина», некаторыя «кірчыкамі» і точка.

Народных і рэволюцыйных мотываў льшасьць зусім ня ведае.

Вось з гэтага становішча, сама па бе і выплывае далейшая задача працы мсамольскіх організацый **у гармошачай галіне.**

За досыць кароткі час наш друк змог рыцягнуць да гармоніку увагу ўсяго саву, стварыў вакол гэтага інструманту амадзкую думку.

У гэтым напрамку мы ня маем ні маейшых дасягненьняў. Нашы і акруговыя рганізацыі да гэтага часу такое пытаньне абыходзілі.

Напрыклад, у адным з нумароў «Ч. З.» ы чытаем, што лепшыя гарманістыя Арнскага акруговага конкурсу атрымалі: **енінскую бібліотэчку, «Чырвоную Зьмену», «Комуністычны шлях», грамату.**

Гэта, само сабою разумеецца, рэчы цікавыя, але неабходна даць гарманістаму нешта конкрэтнае, практычнае, як, напрыклад, **самавучыцель з цыфравой сыстэмай, зборнік прыпевак і г. д.**

Грош цана будзе той працы, калі чэйка толькі згодзіцца, ці пастановіць: **«гармонік прасунуць у масы моладзі**, або **«ў культурна-масавую працу».**

Трэба ставіць і вырашаць конкрэтныя задачы. А іх ня шмат:

1—Пашырыць рэпэртуар гарманістага (купіць яму самавучыцель, дастаць добры сьпеўнік і інш).

2—Працягваць думку колектыўнай куплі гармоніку. У гэтым напрамку трэба ўзяць прыклад з Барысаўскага заводу імя «Домбаля», моладзь якога за агульныя сродкі выпісала гармонік.

ГАРОШЫН.

„Няма часу сьпяваць“.

(Вільшчынская ШСМ, Меншчына).

На прапанове настаўніцы школы, нашы вучні з вялікай ахвотай організаваліся ў харавы гурток. Дагаварыліся з Станькаўскай настаўніцай **Пятровай** аб кіраўніцтве гуртком. Апошняя дала сваю згоду.

У дзень занятхаў паслалі падводу ў Станькава па кіраўніцу хор-гуртком. Шэфмяты з напруджанасьцю чакалі. І што-ж?

Пятрова ня прыехала:—часу ня мае, нагрузка вялікая.

Дзе-ж нам узяць кіраўніка?

М. Васілец.

ЗА ВЯСЁЛУЮ ЦІКАВУЮ ВЯЧОРКУ!

Замацуем нашы дасягненьні ў гэтай галіне

Вопыт наладжваньня чырвоных комсамольскіх вячорак, як мерапрыемства па барацьбе з хуліганствам, як сродак прыцягненьня масы моладзі да культурнага і разумнага досугу—сябе поўнасьцю апраўдаў.

Аб гэтым гавораць сотні лістоў, атрымліваемых рэдакцыяй ад сваіх юнвяскораў, сьцьвярджалі такое зьявішча і выступленьні таварышоў на апошніх акруговых конфэрэнцыях ЛКСМБ, асабліва на Менскай.

Адсюль вывад, што ў далейшым нашым комсамольскім ячэйкам трэба ўзяцца за гэту справу яшчэ больш рашуча, каб гэтая жывая форма культурна-масавай працы не замірала, а пашыралася.

Калі наладжваць вячоркі

Іх трэба перш за ўсё разьлічваць на час адпачынку моладзі. З гэтага і павінны браць корні розныя пляны вячорак, розныя практычныя мерапрыемствы ў комсамольскай працы ў гэтай галіне.

Трэба цамятаць, што старыя, п'яныя пагулянкі можна будзе замяніць з посьпехам новымі тады, калі гэтыя новыя будуць задавальняць жаданьні моладзі, калі яны будуць уносіць у хлапца ці дзяўчыну прыгожыя эстэтычныя адчуваньні, бадзёрасьць да заўтрашняй творчай працы, калі яны будуць багаты вясёлымі элемэнтамі, якія разам з тым пашыраюць кругагляд моладзі, узбагачаюць яе ведамі для паляпшэньня сельскай гаспадаркі, для колектывізацыі праз коопэрацыю гаспадарак і г. д.

У тых вёсках, дзе няма клюбаў, хат-чытальнень, усяму гэтаму перашкаджае адсутнічаньне памяшканьня. У вёсках, дзе ёсьць спэцыяльныя памяшканьні для масавай працы (у мястэчках яны бязумоўна ёсьць) ячэйка рыхтуецца да комсамольскай вячоркі ўся ў цэлым. Вызначаецца плян, даюцца паасобным комсамольцам заданьні (падрыхтаваць гульню, прыпеўкі, галаваломкі), вызначаецца дзень і вячорка праводзіцца. А ў тых вёсках, дзе такіх памяшканьняў няма (а нам думаецца, такіх вёсак яшчэ большасьць) трэба скарыстаць хаты «дзявочых хаўрусаў».

На вячоркі кожнага «дзявочага хаўрусу» разам з беспартыйнымі хлопцамі ходзяць і комсамольцы. Такіх комсамольцаў бюро ячэйкі бярэ пад увагу, дае ім заданьні і хлопцы рыхтуюцца да комсамольскай вячоркі. Апошнім трэба старацца рабіць так, каб гэта не насіла формы «прадстаўніцтва». Трэба ажыцьцяўляць програму вячоркі па меры магчымасьці і мэтазгоднасьці. Напрыклад, у хаце скокі. Скакаць уся моладзь ня ўмее, ды ня можа. Большая частка стаіць колам ды нудзіцца. Комсамольцы ў скоках прымаюць самы невялічкі ўдзел, потым організоўваюць гульню, сьпевы і іншае.

Скарыстаем самадзейнасьць масы.

Ня трэба шмат часу і працы, каб наладзіць цікавую і вясёлую комсамольскую вячорку. Для гэтага АПА ячэйкі ці сама падбірае цікавы матар'ял, ці даручае гэту працу групцы больш актыўнай моладзі.

Трэба пазьбягаць выпадкаў, калі адзін чалавек зьяўляецца нязьменным кіраўніком усяе вячоркі. Пры такім парадку і цікавая вячорка гатова паказацца нуднай. Трэба прыцягваць усю моладзь, як да ўдзелу ў практычнай працы вячоркі, так і да кіраўніцтва ёю.

У нашых вёсках ёсьць шмат сваіх «таленавітых» людзей.

Адзін добра сьпявае, другі грае, трэці апавядае, чацьверты жарты выкідае, пяты можа падражаць прыродным гукам і г. д. Такіх «талентаў» трэба выкарыстоўваць ва ўсю. Яны прынясуць вячорцы вялікую жывасьць і яшчэ большую зацікаўленасьць.

Аб месцы на чырвоных вячорках гульняў, песень, музыкі, загадак, штукарстваў і інш. мы ўжо пісалі ў папярэдніх нумарох газэты «Чырвоная Зьмена» і паўтарацца ня варта.

Дзе ўзяць матар'ял

Праз пару тыдняў выйдзе ўжо нарэшце ўсімі чаканая і многімі абяцаная кніжка **«Комсамольскія вячоркі»**, якую выпускае Белдзяржвыдавецтва. Яна багатасьцю матар'ялу зьявіцца грунтам далейшых комсамольскіх вячорак.

Цяпер можна параіць некалькі Маскоўскіх брошурак: «Комсамольские посиделки» (Молодая Гвардия); «Рождественская вечеринка» (Мол. Гвар.); «Октябрьская вечеринка в деревне» (Мол. Гвар.). Хоць гэтыя кніжачкі кампанійскага выгляду, але ў іх можна знайсьці шмат агульна-цікавага матар'ялу.

На беларускай мове ёсьць два сьпеўнікі (комсамольскі і піонэрскі), а таксама цікавая кніжка Хэйфеца і Задорына «Гульні юных піонэраў». Гэтыя кніжкі прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ.

Таксама неабходна скарыстоўваць вясёлы матар'ял з газэт і часопісяў (асабліва раім сялянскую часопісь «Лапоть» і «Крокодил».).

З. Паваротны.

Саюзныя навіны.

(У ЦК УсеЛКСМ).

9 год Чырвонай Арміі.

23-га лютага спаўняецца 9 год з дню організацыі Чырвонай Арміі. Сьвяткаваньне гадавіны ў гэтым годзе павінна прайсьці, пад знакам агляду ўзброенай магутнасьці СССР і праверкі організацыі абароны СССР.

ЦК УсеЛКСМ зьвярнуўся са спэцыяльным лістом да ўсіх організацый наконт правядзеньня гэтай гадавіны. Комсамольскія організацыі павінны падвесьці вынікі сваей вайсковай падрыхтоўкі і распаўсюджваньня вайсковых ведаў сярод насельніцтва. У гэты дзень комсамольскія організацыі павінны правесьці сходы беспартыйнай моладзі і комсамольцаў для растлумачэньня ваеннай пагрозы Савецкаму Саюзу. У гэты-ж дзень павінны быць вызначаны меры ўзмацненьня працы і ўдзелу комсамольцаў у добраахвотных ваенных таварыствах (Авіахім, ТСА, гурткі стралковага спорту і г. д.).

На лінкор.

Для ўдзелу ў сьвяткаваньні гадавіны Парыскай Комуны на падшэфным судне «Парыская Комуна», выяжджае туды к 8-му сакавіка прадстаўнік ЦК ЛКСМБ, які там зробіць даклад аб працы ЛКСМБ.

240.

Улетку г.г. адбудзецца першы ў Беларусі выпуск школ сялянскай моладзі. Канчаюць школы пасьля 3-хгадовага навучаньня 240 маладых сялян будучыя культурныя гаспадары,

Вопратка для пераросткаў.

Дзеля таго, каб забясьпечыць вопраткай пераросткаў, выпушчаемых дзіцячымі дамамі, ЦК дапамогі дзецям асыгнаваў 4479 руб.

СЁНЬНЯ ВЕЧАРАМ

менская моладзь ідзе ў тэатр

Ставіцца п'еса А. Міровіча «Перамога». Амаль усе білеты на гэты спэктакль прададзены. Рэшта білетаў на «Перамогу» ў касе тэатру.

Купляйце білеты на 2-гі спэктакль

„Стралок Тэль“

Білеты ад 15 да 75 кап. прадаюцца днём у рэдакцыі «Чырвонай Зьмены», а вечарам у клюбе імя КІМ.

РЭВІЗІЯ ІДЗЕ!

(У вышэйшым судзе)

Шынкевіч — прыказчык сельскага коопэратыву (вёска Камышаўцы, Барысаўшчына) быў заняты разрашэньнем важнага пытаньня над назвай «**як выйсьці сухім з вады**».

Гэта пытаньне была для Шынкевіча пытаньнем жыцьця і сьмерці... Надыходзіла рэвізія, а ў касе коопэратыву нехапала шмат грошаў.

— Вось становішча... Што рабіць?.. Я-ж... Я-ж... растратчык!— думаў Шынкевіч і ня ведаў, што рабіць.

Але выхад быў знойдзен. І нават досыць орыгінальны.

Адноўчы камышаўскія сяляне ўбачылі што ў памяшканьні вясковага клюбу успыхнула полымя і праз вокны стаў прабірацца ўдушлівы едкі дым...

— У чым справа?! Браткі—гэта-ж і наш коопэратыў згарыць. Што за неасьцярожнасьць! У адным будынку і наш клюб і наш коопэратыў...

Сяляне ня далі разгарацца агню.

Нехта ўзламаў вокны. Бухнулі ў сярэдзіну вёдры вады.

Пажар папярэдзілі.

Аказалася, што падпал вясковага клюбу, а таксама і коопэратыву (адзін будынак) зрабіў сам **Шынкевіч** сумесна з сваім калегаю **Згірканам Пілiпам.**

Падпал быў зроблены з мэтаю замясьціць сьляды злачынства—«выйсьці сухім з вады»... Аднак, гэта ня ўдалося.

Менскі акруговы суд, разглядаўшы гэту справу, прыгаварыў **Шынкевіча** да 2 год і **Згіркана** да 1 году і 6 месяцаў турэмнага зьняволеньня.

Вярхоўны суд пакінуў прыгавор у моцы.

В і й.

Бялізна, вопратка, абутак

Менскае акруговае праўленьне таварыства прыхільнікаў дзяцей прымае захады да паляпшэньня матэр'яльнага становішча выхаванцаў дзіцячых дамоў. Адпушчана 1.000 рублёў на закупку бялізны цёплай вопраткі і абутку для дзяцей дзіцячых дамоў.

Адначасна асыгнавана 1.300 рублёў на дапамогу беспрытульным.

„ФАУСТ“ ці „КІРПІЧЫКІ?“

СУР'ЁЗНАЯ МУЗЫКА ПЕРАД СУДОМ МОЛАДЗІ

За здаровы пролетарскі погляд на мастацтва!

Самае цікавае на гэтым судзе было тое, што прыгавар вынесьлі адразу-ж пасьля абвінаваўчага акту, у самым пачатку «працэсу. І прыгавар прачытаў не судзьдзя а праявілі вясёлыя юнацкія воплескі.

Суд над сур'ёзнай музыкай. Гэта цікава. Хто яна—гэта сур'ёзная музыка і чым яна адрозьніваецца ад нашых родных песень?

Адказ на гэтыя пытаньні несься са сцэны клюбу «КІМ». Адказвалі шырокія знаёмыя гукі гармошкі і тонкія, нежнасумныя варыяцыі скрыпкі. Выконвалі на гармошцы «Кірпічыкі», а на скрыпцы—фантазію Вяняўскага «Фауст».

Але па парадку. Абвясьціўшы суд над сур'ёзнай музыкай адчыненым, старшыня прачытаў грозны абвінаваўчы акт: сур'ёзная музыка абвінавачваецца ў многіх грахах. Яна незразумела, недаступна шырокім масам нашай моладзі. Для моладзі ня ўстрайваюцца концэрты, а калі такія і бываюць, дык перад выконваньнем якой небудзь складанай рэчы не даюцца патрэбныя растлумачэньні. Музычныя сілы не праводзяць аніякай масавай працы ў горадзе, а між тым музыка магутнае культурнае аружжа, вялікае мастацтва, да якога імкнецца і якое кахае наша моладзь.

І калі замоўклі словы абвінаваўчага акту, на сцэне зьявіліся два музыканты: маленькі, усім знаемы гарманісты Вася і скрыпач Музтэхнікуму Тух. Яны будуць дэмонстраваць прыклады «нясур'ёзнай» народнай і «сур'ёзнай» клясычнай музыкі. Вася грае «Кірпічыкі», Тух фантазію «Фауст»...

Пачалі...

І дзіўна! Атрымалася тое, што ніхто не чакаў. І «Кірпічыкам», і «Фаусту» аднолькава апледыравалі—гэтыя рэчы аднолькава спадабаліся моладзі!

Абвінавайца і абаронца былі некалькі зьдзіўлены. Аднак гэта не пашкодзіла ім закідваць сьведкаў шматлікавымі запытаньнямі. Адказы сьведак былі вельмі характарны. Яны як раз і падцьвярджалі той «**прыгавар**», які быў вынесен у пачатку.

Сьведка Хэйфэц. Моладзь імкнецца да сур'ёзнай музыкі. Нядаўна ў клюбе КІМ быў концэрт Музтэхнікуму, які надзвычайна спадабаўся моладзі. Напрыклад, «Мазурку» Веняўскага прасілі выканаць некалькі раз—так яна спадабалася... Дрэнна тое, што моладзі не растлумачваюць зьместу і значэньня тэй ці іншай музычнай рэчы. Трэба весьці ў гэтым напрамку выхаваўчую працу.

Моладзь таксама вельмі кахае так званую «нясур'ёзную» народную музыку... Нядаўна ў гэтым-жа клюбе КІМ выступала трые Галубка (скрыпка, гармошка, цымбалы) і карысталася вялікім посьпехам...

Сьведка Мазель. Моладзь павінна азнаёміцца з клясычнай музыкай. Усякія «танныя» музычныя рэчы, як «фокс-трот» «кірпічыкі» і г. д. утвараюць вельмі слабае ўражаньне. А між тым, калі чуеш сур'ёзны музычны твор, ён надоўга запамінаецца, аб ім потым многа думаеш... Я нават плакаў адзін раз...

Сьведка Рубенчык. Тут казалі, што клясычныя мэлёдыі «трогали человечество». Я таксама частка «человечества», але яны мяне чамусьці не чапаюць! (Сьмех). Вось я нядаўна быў на концэрце квартэту Глазунова і мяне здаволіла толькі адна рэч... Бачыце, яна так хутка выконвалася і гукі пераходзілі з тонкіх у тоўстыя, а з тоўстых у тонкія... (Рогат). Я лічу, што наша простая музыка—лепей усяго.

Сьведка Сэрабранскі. Я прымаю ўдзел у духавым оркэстры клюбу «КІМ» і ведаю, што нашы рабочыя хлапцы вельмі жадаюць азнаеміцца з творамі вялікіх композітараў. Нават мы самі пачынаем граць даволі сур'ёзныя рэчы. Нельга карміць моладзь адным «кірпічыкамі»! Трэба організоўваць для моладзі і сур'ёзныя концэрты.

Як відаць, гэтыя нешматлікавыя, але вельмі багатыя па зьместу, паказаньні сьведкаў сказалі ўжо ўсё. 50 цісулек, якія веерам засыпалі судзейскі стол, толькі паўтаралі на розны лад вышэйсказанае.

Абвінавайцу—тав. **Маркоўскаму** і абаронцу—тав. **Дрэйзіну** мала што засталося сказаць.

Т. Маркоўскі нечакана аб'явіў, што ад сур'ёзнай музыкі моладзь будзе «храпець»... Як прыклад, ён прыводзіў факт, што калі чырвонаармейцам сыгралі твор Чайкоўскага—яны нічога не зразумелі, але вось, калі сыгралі «Дубинушку», дык заля проста «хадуном хадзіла»...

— Сур'ёзную музыку,—сказаў ён, трэба прасоўваць у масы паступова, а не адразу!..

А хто з гэтым не згодзен?—запытаў абаронца тав. **Дрэйзін**, і вельмі правільна запытаў. На самай справе, ніхто ня супроць таго, каб сур'ёзную музыку прэпадаваць моладзі паступова, з адпаведнымі растлумачэньнямі. Але некаторыя ставяць пытаньне так, што наогул нам сур'ёзная музыка непатрэбна, што гэта «буржуазныя забабоны»... Мы будзем змагацца з такім поглядам, бо гэта погляд не пролетарскі, а мяшчанскі, абывацельскі... Рабочай моладзі неабходна ўладаць такім моцным культурным аружжам, як музыка, рабочай моладзі трэба ведаць творы геніяльных композітараў.

Вывад Дрэйзіна быў наступны: трэба прасунуць сур'ёзную музыку ў нашыя рабочыя, комсамольскія клюбы, але прэпадаваць яе ў патрэбным выглядзе і ў парадку паступовасьці.

Гэтыя словы аўдыторыя сустрэла вельмі добра.

А прыгавар «рэзюміраваў» *вялікі інтарэс да музыкі з аднаго боку, і нездаволенасьць большасьцю Менскіх концэртаў з другога боку, тырхаюць моладзь да захапленьня такімі рэчамі, як „кірпічыкі“, „фокстрот“, „Шумна ў доме Шнеерзона“ і г. д. Гэтыя рэчы ня маюць вялікага выхаваўчага значэньня.*

Выходзячы з гэтага, суд ад імя Рабоча-Сялянскай грамадзкасьці заклікае ўсе музычныя сілы Менску, а ў прыватнасьці Беларускі Дзяржаўны Музтэхнікум, каб яны трымаліся лініі паступовага музычнага выхаваньня моладзі, прывучалі яе да сур'ёзнай музыкі шляхам дачы кожнай музычнай працы адпаведнага растлумачэньня.

Суд лічыць, што толькі такім шляхам, ступенька за ступенькай, моладзь будзе музычна выхоўвацца і заўладаць гэтым моцным аружжам пролетарскай культуры.

* * *

Нядаўна ў «Комсомольскай Правде» пісалася аб выступленьнях Персім-фансу (першы сімфонічны ансамбль без дырыжору) на Маскоўскіх фабрыках і заводах. Рабочыя вельмі добра сустрэлі гэтае пачынаньне.

«Комсомольская Правда» адзначае па гэтаму поваду: «трэба ў сур'ёз наставіць «музычнае пытаньне» перад грамадзкасьцю. Аб гармошцы шумім на ўсю акругу—і гэта надрэнна—але гэта зусім не павінна перашкодзіць гаварыць аб вялікай музыцы і ня толькі гаварыць, але і рабіць—прасоўваць яе ў масы».

Гэта вельмі своечасовы лёзунг.

Суд над музыкай, праведзены юнсэкцыяй Дому Працасьветы, у клюбе КІМ—толькі падкрэсьліў, што моладзь імкнецца, стыхыйна імкнецца да заўладаньня музычнай культурай.

— Галасуем за «Фауст»!

Міх. Гольдбэрг.

„Змрок“

(Пастаноўка Белдзяржтэатру)

Яскравыя малюнкі беларускай вёскі ў 1920 годзе. Глухія куткі Палесься, куды толькі што павеялі вольныя ветры Кастрычніка. Сяляне, асабліва беднота, сталі адчуваць сябе гаспадарамі. Ня трэба гнуць сьпіну перад панам, каб дазволіў засеяць вузенькі шнурок. Савецкая ўлада надзяляе зямлёю беднякоў-сялян.

Але ў той-жа час апарат савецкай дзяржавы—слабы. Многа неправільнасьці і злачынстваў. У той-жа час кулак ня сьпіць. Ён стараецца пралезьці ў сельсавет, коопэрацыю, «прымазацца» да вышэйстаячых органаў.

На гэтым соцыяльным фоне разгортваецца драма.

Прыгожая дэкарацыя першага акту. Сяляне дзеляць поплаў былога пана. Пры падзеле яны разьбіваюцца на дзьве часткі: беднякоў і кулакоў. Кулакі бяруць верх, бо іх прадстаўнік—старшыня сельсавету. Беднякам-дуля над нос. Кулакі лепшы сенакос забіраюць сабе. Старшыня валаснога Земаддзелу таксама на іх баку, бо яны яго падкупілі.

Але вось зьяўляецца новы чалавек у вёсцы—сын найбяднейшага селявіна Ігната. Кулакі устрывожыліся, яны пачулі ў ім свайго ворага.

Сын Ігната Міхалка прыехаў з Амэрыкі, ён вельмі кахае сваю бацькаўшчыну, сваіх сялян-беднякоў. Прыехаўшы, ён зараз-жа далучаецца да беднякоў і робіць захады да выкрыцьця усіх неправільнасьцяй і злачынстваў.

У Міхалкі таксама «сардэчная рана», ён сустракаецца з сваёю даўнейшаю каханкаю, якая цяпер жонка буйнейшага кулака вёскі—старшыні сельсавету.

Прыгожая ліпневая ноч. Хмаркі, як авечкі, плывуць кудысьці далёка-далёка. Спатканьне. Шэпты і пацалункі. Гэта Міхалка і яна даўнейшая.

За Міхалкам сочыць сакратар сельсавету—дробны кулачок тэй-жа вёскі.

Раптам—пажар. Загарэлася гумно старшыні сельсавету. Міхалка кідаецца ратаваць, але сакратар сельсавету, які сачыў за ім, голасна крычыць: «**Вось падпальнік—лавеце яго!**».

Такім чынам кулакам удаецца узваліць усю віну за пажар на Міхалку.

Апошні акт...

Тайны сход на кватэры кулака—старшыні сельсавету. Спойваньне і адурачваньне сялян, нарэшце—забойства Міхалкі... Змрок, густы змрок...

Бедняк паказан вельмі сьлязьлівым і пакорлівым. Гэта—не характэрна для нашай вёскі.

Добра выканалі ўсе артысты свае ролі. «Змрок» глядзіцца з захапленьнем. П'есу гэтую трэба прасунуць у вёску, дзе яна зробіць вялікую справу. Працоўныя сяляне яскрава пабачаць свайго ворага.

Аднак, недахопы ў пастаноўцы ёсьць. Міхалка зьяўляецца як-бы новым будаўніком вёскі, але ён нічога ня робіць конкрэтнага ў гэтым напрамку, хіба толькі акрамя записки, якую ён напісаў беднякам.

Апошні акт у аўтара ня зусім удаўся. Кулакі забіваюць будаўніка новай вёскі. Міліцыянэр улятае ў хату і разьвязвае адным паказаньнем рэвольвэру ўсё пытаньне! Кулакі пакараны. «Справедливость торжествует»!..

Усё-ж рэкомэндуем п'есу нашай моладзі.

М. Х.

ДА 23-ГА

Як рыхтуецца комсамольскі Менск?

Да дню 9-й гадавіны Чырвонай Арміі —23-га лютага г. г.—комсамольскі Менск дзейна рыхтуецца.

Згодна пляну, распрацаванаму Агітпропам АК ЛКСМБ, напярэдадні сьвята склікаюцца агульныя сходы ячэек сумесна з вайсковымі часткамі, на якіх абмяркоўваюцца конкрэтныя задачы ячэек у галіне ваеннай працы.

Організуюцца экскурсіі грамадзянскіх ячэек у свае падшэфныя вайсковыя часьці, у часе якіх комсамольцы знаёмяцца са зброяй (разбор вінтовак, кулямётаў, надзяваньне процівагазаў), жыцьцём чырвонаармейцаў і г. д.

У дзень сьвята ячэйкі ЛКСМБ і падшэфныя вайсковыя часткі наладжваюць супольныя вечары, прысьвечаныя 9-й гадавіне Чырвонай Арміі з наступнай праграмай: даклад, успаміны старых чырвонаармейцаў, мастацкая частка (п'есы, інсцэніроўкі, дэклямацыя і інш.).

Да 23-га лютага прыўрочваецца організацыя ў ячэйках ваенных гурткоў і куткоў, стралковых выпярэдніцтваў і адчыненьне ціраў. Праводзіцца кампанія за **ўцягненьне комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў Таварыства Садзейнічаньня Абароне і Авіяхіму СССР.**

Юнсэкцыі профклюбаў наладжваюць спэцыяльныя вечары для моладзі з дакладамі аб міжнародным становішчы і значэньні Чырвонай Арміі і концэртамі.

Вайсковы гурток клюбу КІМ рыхтуе паказальны вечар.

Піонэры праводзяць на зборах атрадаў і зьвеньняў гутаркі аб Чырвонай Арміі, заслухоўваюць успаміны старых чырвонаармейцаў. Ляхаўскае райбюро ЮП рыхтуе раённы піонэрскі вечар сумесна з падшэфнымі чырвонаармейскімі часьцямі.

Усё сьвята павінна прайсьці пад лёзунгам праверкі практычнай працы ячэек па ваенізацыі і вызначэньня далейшых задач у гэтай галіне.

ПА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

Чырвоны Сейбіт, № 6-7 студзень 1927 г.

Папярэднія нумары літаратурна-мастацкага дадатку да «Беларускай Вёск[і]» спадабаліся чытачу і прымусілі яго з н[е]цярплівасьцю чакаць выхаду ў сьвет [на]ступнага нумару.

Нарэшце зьявіўся № 6-7.

Новае апавяданьне **Крапівы** над на[з]вай «Сьмерць» у гумарыстычных рыс[ах] малюе перад намі ўсім знаёмую пост[аць] бюрократа-чынушы, якому жыцьцё л[ю]біма[е] ката даражэй жыцьця чалавека.

Антось Замежны у сваім апав[я]даньні «Окупанты» дае цікавы характ[эр]ны абразок з жыцьця польскіх абшар[ні]каў і малюе іх зьдзекі над «быдлам» сялянскім працоўным людам.

А. Аляксандровічу ўдалося ў в[е]рзавай, вершаванай форме перадаць м[а]стацкую легенду з старых часоў.

Цікавы з фармальнага боку ве[рш] **Маракова**.

Вельмі добра, што ў часопісе побач видомымі і вызначыўшымся поэтамі др[у]куюцца таксама і творы маладых, пач[ы]наючых поэтаў.

Характэрным зьяўляецца артык[ул] вясковага настаўніка, які закранае п[ы]таньне аб асаблівасьцях творчасьці мал[е]нькоўцаў і робіць вывад, што побра[зы] ствараемыя апошнімі, не зразумелы ч[ы]тачу, зьяўляюцца проста лішнімі. З [не]каторымі пунктамі артыкулу можна згадзіцца, але ў асноўным аўтар праві[льна] на выказаў думкі сялянскага чытача.

Аддзел бібліографіі—багаты. У ім сустракаем ацэнкі апошніх беларускіх [лі]таратурных навінак.

Часопісь не пазбаўлена недахопа[ў] шурпатасьцяй.

З.

ЗАПЫТАНЬНІ І АДКАЗЫ

Запытаньне № 803 (Белайкіна[)]. Ці павінен вучань плаціць у школу гро[шы] за навучаньне, калі яго бацька быў [ін]валід і памёр, а ён сам знаходзіцца цяпер на ўтрыманьні страхкасы?

Адказ. Такі вучань плаціць не па[ві]нен.

Запытаньне № 804 (Міх. Зак) [Да] мяне дайшлі чуткі, што ў Менску адч[ы]нюцца нейкія газэтныя курсы. Ці праў[дзі]на гэта?

Адказ. Такія курсы ў Менску [не] адчыняюцца. У Комвузе толькі існуе [ад]дзяленьне з газэтным ухілам.

Запытаньне № 805 (Петруша). [Ці] будуць у сямігодках вясеньнія вакацы[і], калі будуць, дык на які тэрмін?

Адказ. Вясеньнія вакацыі ў сямі[год]ках будуць з 1-га па 10 красавіка. [У] вясковых школах, дзе заняткі пачына[юц]ца пазьней і канчаюцца раней, вясен[нія] вакацыі ня будуць.

Запытаньне № 806 (Астрашанов[а]). Чым тлумачыцца тое, што часопісь «[Бе]ларускі Піонэр», выпісаную на студ[зень] м-ц, я не атрымаў?

Адказ. Напішы аб гэтым ліст у [рэ]дакцыю часопісі «Беларускі Піонэр» з [до]кладным указаньнем адрасу.

Запытаньне № 807 (Сапкіна). Чаму «Чырвоная Зьмена» выходзіць [не]рэгулярна?

Адказ. Гэта зусім не правільна. «[Чыр]воная Зьмена» выходзіць цяпер рэгу[лярна] па тры разы ў тыдзень—у сераду, [пят]ніцу і нядзелю.

Запытаньне № 808 (Хацкеві[ч]). Ці вышла ў сьвет 3 частка роману Ц[ішкі] Гартнага «Сокі Цаліны»?

Адказ. Не, 3 частка яшчэ ня в[ыйш]ла.

Апавяшчэньні

— У сераду 16 лютага ў 7 га[дзін] у памяшканьні райкому склікаецца на[рада] павадыроў фарпостаў Гарраёну.

— У чацьвер 17 лютага чарг[овыя] заняткі АПА сэмінарыя Гаррайкому. П[а]чатак а 9 гадзіне ўвечары.

Да ведама ўсіх комсамольцаў Беларусі

Конфліктная Камісія ЦК ЛКСМБ, у мэтах зьлішчэньня перапіскі і скарачэньня занятаў разглядаючы конфліктных спраў, даводзіць да ведама ўсіх комсамольцаў, што апеляцыйныя заявы на пастанову Акруговых КСМ аб неправільным выключэньні з саюзу, ці іншыя комсамольскія ўзысканьні, адрасаваныя на імя КК ЦК ЛКСМБ, павінны падавацца праз Акруговы Камітэт, які прыкладае ўсе матэр'ялы па данай справе і накіроўвае ў КК ЦК.

Заявы, якія будуць падавацца непасрэдна ў КК ЦК, **апошній разглядацца ня будуць.**

Конфліктная Камісія ЦК ЛКСМБ.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІН.

Галоўлітбел № 23991. 2 Дзярждрукарня БДВ.